ЛИТЕРАТУРА

1. ***Маскаленко В.В.*** Социализация личности. Киев, 1986. – 241 с.
2. ***Фромм Э.*** Человек для себя. Мн., 1992. – 253 с.
3. ***Рубинштейн С.Л.*** Бытие и сознание. М., 1967. – 327 с.
4. ***Кузьмина Н.В.*** Основы вузовской педагогики. Л., 1968. – 311 с.
5. ***Ливанова Е.А.*** Формирование практической готовности учителя к взаимодействию с учащимися во внеучебной деятельности: Автореф. дис. докт. пед. наук. М., 1995. – 31 с.
6. ***Здравомыслов А.Г.*** Потребности. Интересы. Ценности. М., 186. – 223 с.
7. ***Сухомлинский В.А.*** Потребности человека в человеке. М., 1978. – 98 с.

SUMMARY

The success of the socialization depends on the complex of the psychological and pedagogical conditions.

Поступила в редакцию 7.02.2002

УДК 808.26/07

Л.С. Васюковіч

З гісторыі падручніка па беларускай мове: урокі і вопыт 30-х гадоў

Зварот да гісторыі станаўлення вучэбнай кнігі па мове дае магчымасць усвядоміць дыялектычнасць ацэнак у поглядах на падручнік, яго месца і ролю ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, асэнсаваць зменлівасць характару патрабаванняў да асноўнага сродку навучання. Спасціжэнне ўрокаў пройдзенага шляху дае падставу ацэньваць нацыянальную вучэбную кнігу не як вынік суб'ектыўнай дзейнасці асобных аўтараў, а бачыць у ёй гістарычна-культурны феномен, што выступае матэрыяльна-аб'ектыўным прадуктам пэўнага перыяду ў развіцці грамадскай, лінгвістычнай, педагагічнай і метадычнай думкі.

У 30-я гады ў адпаведнасці з устаноўкамі дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі ў праграмах па беларускай мове, як і па іншых прадметах, дамінуе класава-палітычны кантэкст, які прэваліруе пры разглядзе моўных з'яў і фактаў. «Школа павінна выхаваць у кожнага вучня братэрскую адданасць працоўным усяго свету, незалежна ад іх нацыянальнага паходжання, варожасць да ўсіх прыгнятальнікаў, да якой бы нацыі яны ні належалі... Вучань ужо з першых крокаў павінен адчуць, што ён з'яўляецца членам працоўнага калектыву і павінен падначаліць свае інтарэсы інтарэсам гэтага калектыву» [1].

Пралетарска-класавы падыход прадвызначаў змяшчэнне акцэнтаў у задачах школы. Складальнікі-ідэолагі праграмы 1932 года максімальна поўна рэалізавалі заказ грамадства, які быў прадыктаваны сацыяльна-палітычнымі фактарамі. «Мова з'яўляецца вострай зброяй класавай барацьбы і важным фактарам сацыялістычнага будаўніцтва. Таму правільная пастаноўка выкладання мовы ў школе мае велізарнейшае значэнне для падрыхтоўкі добра ўзброеных будаўнікоў сацыялізму» [2]. У названай праграме мова як зброя класавай барацьбы выяўляла «схаваную» палітычную сутнасць моўных

з'яў: «Азначэнне сказа як адзінкі паведамлення, адбіваючай праз класавую свядомасць аб'ектыўную рэчаіснасць» [2, с. 5]; «барацьба за класавую мэтанакіраванасць і культурнасць мовы» [2, с. 7]; «Мова класаў. Літаратурная мова як мова пануючага класа і дыялекты мас. Станаўленне літаратурнай мовы пралетарыяту. Класавая барацьба ў мове і за мову. Мова на службе сацыялістычнага будаўніцтва СССР» [2, с. 9].

Класава-пралетарскі змест набываюць публікацыі часопіса «Асвета», які першапачаткова ставіў перад сабой культурна-асветныя і метадычныя задачы: «У першую чаргу рэдакцыя імкнецца задаволіць патрэбы працаўніка вёскі, дзе так востра адчуваецца недахват у метадычнай літаратуры» [3]. Гл. таксама: «За гэты час часопіс «Асвета» здолеў згрупаваць вакол сябе актыўную групу настаўнікаў, якія ў сваіх артыкулах сістэматычна асвятляюць практычны вопыт савецкай школы. Рэдакцыя ставіць сабе за мэту зрабіць «Асвету» адным з галоўных педагагічных дапаможнікаў» [3, с. 3]. Пераарыентацыя асветна-метадычнага аспекту на палітычны лёгка заўважаецца нават па загалоўках публікацый часопіса, пачынаючы з другой паловы 1929 года: «Класавая барацьба на навуковым фронце БССР», «Грамадска-палітычнае выхаванне ў дзіцячым садзе», «Беларускі нацыянал-фашызм і нацыянал-дэмакратызм», «Супраць варожай ідэалогіі», «На арэну класавага змагання», «Нацыянал-дэмакраты за «працай», «Падрыхтоўка навуковых кадраў паводле шкодніцкага плана наццэмаў», «Знішчыць рассаднікі нацыянал-дэмакратызму ў савецкай працоўнай школе» і інш. Наогул, устаноўка наблізіць школу «да фабрыкі, да завода, да вытворчасці» спараджае палітызаваную лозунгавасць, плакатнасць друкаваных матэрыялаў: «Узмацніць класавую пільнасць і непрымірымасць у барацьбе за правільнае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Перабудаваць усю працу Наркамасветы і яго органаў у адпаведнасці з дырэктывамі партыі і ўрада. Вышэй сцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму».

Новая рубрыка ў часопісе «Асвета» – «Аб нашым падручніку» – (з'явілася ў 1927 годзе, № 2) першапачаткова задумвалася з мэтай даваць «здаровую ацэнку на наш падручнік пры шырокім удзеле масавага працаўніка асветы», а ператварылася ў плацдарм для «палітычных разборак» з аўтарамі. Зазначым, што сам факт перайменавання часопіса «Асвета» у «Камуністычнае выхаванне» (з 1930 года) меў ідэалагічную падаплёку: «Старая назва нашай часопісі «Асвета» у сучасны перыяд разгорнутай класавай барацьбы ўжо ўстарэла. Гэтая назва не адлюстроўвае якасных асаблівасцей нашай класавай установкі ў галіне выхавання і адукацыі» [4]. Разам з пераарыентацыяй часопіса на ідэйную барацьбу, якая, на думку рэдакцыі, павінна «садзейнічаць развіццю тэорыі і практыкі камуністычнага выхавання», імкненне да «здаровай ацэнкі» вучэбнай кнігі перарасло ў «сталую разгорнутую крытыку» як праграм, так і падручнікаў. Пад шыльдай змагання за якасць была распачата кампанія па вырашэнні палітычных задач. «А гэтыя задачы заключаюцца ў тым, каб са сталінскай непрымірымасцю, празорлівасцю і паслядоўнасцю змагацца супраць усіх спроб апартуністаў «справа» і «злева» сказіць генеральную лінію партыі ў школьнай справе, змагацца з беларускім нацыяналізмам як галоўнай небяспекай на даным этапе і шавінізмам іншых масцей» [5].

У адпаведнасці з духам эпохі «барацьбы за сацыялізм» з усіх патрабаванняў да падручніка выдзелілася імкненне да «ідэалагічнай чысціні» любога дапаможніка для школы: «Савецкі настаўнік жадае мець такі падручнік, у якім генеральная лінія Камуністычнай партыі павінна праходзіць чырвонаю ніткаю».

Паспешлівыя рэцэнзіі на падручнікі стракацяць класава-палітычнай тэрміналогіяй (пры гэтым, як правіла, змест, структура, метадычны апарат кнігі не станавіліся прадметам увагі рэцэнзентаў): «аўтары працягваюць традыцыі апартунізму», «кніжка як рассаднік нацдэмаўшчыны», «варожыя падручнікі», «рэакцыйны падручнік», «падручнік, прасякнуты ідэалагічна варожымі ўстаноўкамі», «не падручнік, а палітычна шкодная блытаніна», «супраць шкодных кніжак» і г.д. Нават на адлегласці дзесяцігоддзяў насцярожвае ваяўнічасць, бескампраміснасць у ацэнках дзейнасці аўтараў, чые падручнікі сталі аб'ектам першых рэпрэсіўных мер. Пад страхам быць абвінавачанымі ў нацыянал-дэмакратызме аўтары падручнікаў нават да назваў кніг падыходзілі пад вуглом сацыялістычных пераўтварэнняў: «Чырвоныя ўсходы», «Наш сцяг», «Наша першая граматыка», «Чырвоная зорка», «Зорка», «Чырвоная змена», лемантар «Наша сіла – ніва ды машына» і пад.

Звяртае ўвагу катэгарычнасць, безапеляцыйнасць вульгарызатарска-сацыялагічных ацэнак тагачасных аўтараў, узровень рэцэнзій якіх вызначаўся патрабаваннямі і духам часу, што абавязваў да «нагляду за ідэалагічнай прадукцыяй для школ». Прывядзём вытрымкі з рэцэнзій, змешчаных у часопісе «Камуністычнае выхаванне»: «Як гэты матэрыял стымулюе вучняў на актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве? Як дапамагае зразумець сутнасць класавай барацьбы? Вось асноўныя пытанні, на якія, у першую чаргу, павінен даць адказ змест падручніка, каб вырашыць пытанне прыгоднасці яго для нашай савецкай школы... Даволі павярхоўна паглядзець на падручнік, каб убачыць, што асноўная яго задача – навучанне чытанню, а не праблемы камуністычнага выхавання». Гл. таксама: «Пры ўважлівым разглядзе кніжкі можна канстатаваць, што аўтар з поспехам выканаў загад класава-варожых сіл пралетарыяту беларускіх нацдэмаў, агентаў Прышчэпава, клерыкалаў і інш. У кніжцы вельмі ярка адлюстроўваецца «беларуская самабытнасць», ідэалізацыя прышчэпаўскага тыпу гаспадаркі-хутар, садок, конік, свая кароўка... Прыкрываючыся імем Леніна, аўтар прыпадносіць буржуазную мараль у савецкай працоўнай школе аб «любві к блізкаму, слабаму, аб брацтве ўсіх людзей і імкнецца аслабіць і паралізаваць гэтым баяздольнасць пралетарыяту ў класавай барацьбе».

Асэнсаваць усю жорсткасць «класавага і метадалагічнага кантролю» тагачаснай дзяржаўнай машыны дапамагаюць надрукаваныя ў часопісе «Адкрытыя лісты» Я. Купалы і Я. Коласа, якія былі вымушаныя часам і абставінамі прытрымлівацца духу тагачасных ідэалагічных ацэнак. «Падручнікі для школ у тых ці іншых формах таксама праводзілі шкодныя нацдэмаўскія ідэі шляхам прыкладаў і падборам спецыяльнага матэрыялу, што асабліва кідаецца ў вочы ў школьных граматыках Я. Лёсіка» [6]. Думаецца, гэты перыяд у развіцці савецкай школы, пазначаны тэндэнцыяй «абсалютазаваць класавы падыход», дэманструе гістарычны ўрок бесперспектыўнасці развіцця педагагічных ідэй пры вырашэнні палітычных задач праз адукацыйную палітыку.

Прадузята ацэньваючы дасягненні дарэвалюцыйнай школы, ідэолагі Наркамасветы найперш ставілі ёй у віну адарванасць ад жыцця, што праяўлялася, на іх думку, у залішняй тэарэтызацыі матэрыялу і кніжнасці ведаў, не падмацаваных практычным вопытам, а таксама панаванне славесных метадаў навучання. Імкненне пазбавіцца «ад рэшткаў педагагічнай даўніны» вымушала ад савецкай дыдактыкі пошукаў актыўных формаў навучання, што выклікала да жыцця мнагалікасць і разнастайнасць метадаў школьнай працы. Метадыст Кагараў Е., характарызуючы перыяд 20-х гадоў, пісаў: «Эпоха, якая перажываецца намі, характарызуецца ў галіне методыкі

выкладання нервовымі росшукамі новых шляхоў, нейкім нястрымным стыхійным захапленнем новымі метадамі» [7].

Тагачасная палітычная і грамадская сітуацыя патрабавала ад школы сувязі з жыццём, з вытворчай працай, з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта вымагала выкарыстання ў школьнай практыцы метадаў, скіраваных на выхаванне актыўнасці і самадзейнасці вучняў. Педагагічная рэчаіснасць дэманстравала неабходнасць кардынальных змен у комплексных праграмах, якія не вытрымалі праверкі практыкай. Наспявала патрэба ў новых метадычных рашэннях.

Свядомая арыентацыя на даследчыя (самастойныя) метады навучання абумовіла і з'яўленне новага тыпу вучэбнага дапаможніка – «рабочай кнігі». «Тып падручніка» «Рабочая кніга» за апошнія часы ў школьнай практыцы з'яўляецца самым пажаданым з прычыны таго, што ён, як нельга лепей, адпавядае запатрабаванням нашай сучаснай педагогікі. Разлічваючы на даследчую працу вучня, яго актыўнасць і самадзейнасць у працы, такога роду падручнік утварае спрыяючыя ўмовы для натуральнага і сталага засваення вучэбнага матэрыялу» [8]. Тагачасная педагагічная навука наступным чынам фармулявала задачы, якія ўскладаліся на рабочую кнігу: «1) быць схематычным дапаможнікам у практычнай даследчай дзейнасці вучня, пакідаючы дастатковай прасторы для яго самадзейнасці і ініцыятывы; 2) служыць даведнікам у працы; 3) стымуляваць вучня на пашырэнне і паглыбленне яго працы шляхам пастаноўкі новых праблем, змяшчаць спісы літаратуры; 4) дапаўняць матэрыял, які дзеці здабудуць з уласных назіранняў і доследаў; 5) даваць інструкцыі па прапрацоўцы сабранага матэрыялу; 6) служыць дзецям сродкам уліку і фіксацыі матэрыялу, садзейнічаць яго замацаванню ў памяці вучня» [9].

Даследчыкі па-рознаму ацэньваюць змест і ролю рабочых кніг у гісторыі савецкай школы. Так, выключна негатыўную ацэнку гэтаму тыпу падручніка падаюць аўтары калектыўнай манаграфіі «Нарысы па гісторыі савецкай школы і педагогікі (1921-1931)». «Рабочыя кнігі» не маглі адпавядаць асноўным патрабаванням навукі і методыкі. Яны бессістэмнасцю выкладу, вузкапрактычным і утылітарным падыходам да падбору матэрыялаў часта дэзарыентавалі масавага настаўніка і перашкаджалі яму змагацца за трывалыя і глыбокія веды вучняў. У аснову пабудовы «рабочых кніг» іх аўтары імкнуліся ў абавязковым парадку пакласці прынцып комплекснасці, які не апраўдаў сябе на практыцы, або нейкі пражэкцёрскі метад вучэбнай працы» [10].

Думаецца, аднак, што падобныя меркаванні ўтрымліваюць ацэнку з'яў мінулага «меркамі сучаснасці». Набыткі беларускай методыкі перыяду 30-х гадоў варта разглядаць у рэчышчы станаўлення і развіцця педагагічнай навукі. Планавая сістэматычная праца пад кіраўніцтвам Наркамасветы БССР прыносіла плённыя вынікі. Выпуск падручнікаў, карыстанне імі, аналіз і ацэнка іх, наладжаныя ў перыядычных педагагічных выданнях, паступова фарміравалі грамадскую думку.

Упершыню ў гісторыі беларускага падручніка былі сфармуляваны патрабаванні «навуковага, палітычнага, педагагічнага, метадычна-практычнага і тэхнічнага характару» да вучэбнай кнігі. Спробу асэнсаваць змест і структуру рабочай кнігі можна лічыць пачатковым этапам распрацоўкі тэарэтычных праблем школьнага падручніка. Менавіта на этапе распрацоўкі асноў рабочай кнігі метадычная навука перарасла «стадыю першапачатковага эмпірызму» (Н.А. Бернштэйн) і вылучыла падручнік як аб'ект навуковага даследавання.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Дэталізаваныя праграмы для 1-га канцэнтра сямі – і чатырохгадовае савецкае працоўнае політэхнічнае школы***. Мн., 1929. С. 4-5.

2. ***Праграмы па беларускай і рускай мовах для V, VI, VII груп ФЗС і ШКМ***. Мн., 1932. С. 3.
3. ***Ад рэдакцыі*** // «Асвета», 1925, № 1. С. 2.
4. ***«Камуністычнае выхаванне»***, 1930, № 1. С. 4.
5. ***«Камуністычнае выхаванне»***, 1934, № 1-2. С. 65.
6. ***Адкрыты ліст Я. Коласа*** // «Камуністычнае выхаванне», 1930, № 12. С. 41.
7. ***Кагаров Е.*** Методический словарь. Харьков, 1925. С. 3.
8. ***Запатрабаванні да рабочае кнігі па паасобных комплексах 3-га і 4-га года навучання***: Пастанова навукова-метадалагічнага камітэта НКА // «Асвета», 1929, № 7. С. 89-90.
9. ***Полтавский С.*** На пути к новому учебнику // «Советской школе – новый учебник»: Сборник Госиздата / Под ред. ***Шварца Д.В.*** 1925, № 1. С. 17.
10. ***Королев Ф.Ф., Корнейчик Т.Д., Равкин З.И.*** Очерки по истории советской школы и педагогики (1921-1931). М., 1961. С. 107.

S U M M A R Y

The article deals with the experience of the preparation of work books on the Belarusian language ib the 1930-ies. The requirements to the educational book formulated in this period have enabled to define the textbook as an object of scientific research.

Поступила в редакцию 12.12.2001

УДК 37.033+371.333

У.К. Слабін

Непрацэсарныя экранна-гукавыя сродкі ў экалагічным выхаванні

Вучняў вабяць як зносіны з прыродай у рэальным жыцці, так і яе адлюстраванне ў мастацтве. Нязменна расце іх цікавасць да мастацкай і навукова-мастацкай літаратуры аб прыродзе, да прысвечаных ёй разнастайных фільмаў і тэлеперадач. Выхаваўчую вартасць набываюць, такім чынам, не толькі рэальныя прыродныя аб'екты, але і іх *мастацкія вобразы* [1]. Уяўляецца надзвычай важным выкарыстаць гэты факт для дасягнення мэтаў экалагічнага выхавання і тым на справе рэалізаваць патэнцыял гуманітарызацыі пры вывучэнні прыродазнаўчых навук ва ўмовах глабальнага экалагічнага крызісу і растучай урбанізацыі, наступствам якой з'яўляецца аддаленасць чалавека ад прыроды.

Адпаведна прадстаўленыя мастацкія вобразы прыродных аб'ектаў нязменна прысутнічаюць у дасканалых вучэбных матэрыялах і дапаможніках, а менавіта ў экранна-гукавых сродках (ЭГС). Гэта распаўсюджаныя і – пры забеспячэнні належных умоў – эфектыўныя сродкі экалагічнага, а таксама іншых відаў выхавання на ўроках прыродазнаўчых дысцыплін.

У педагагічнай літаратуры, прысвечанай пытанням экалагічнай адукацыі і выхавання, выкладання прыродазнаўчых дысцыплін, няма адзінства адносна ўжывання тэрмінаў, што датычаць тэхнічных сродкаў навучання, а таксама матэрыялаў і дапаможнікаў, прызначаных для працы з імі. Адны даследчыкі паслядоўна ўжываюць тэрмін «*экранна-гукавыя сродкі*» [2], другія выключна тэрмін «*аўдыёвізуальныя сродкі*» [3], трэція ужываюць разам адзін і другі тэр-